# ІСТОРИЧНІ ПЕРЕДУМОВИ СУЧАСНИХ КОНФЛІКТІВ В УКРАЇНІ

**УДК 94(476)+331.108**
DOI: https://doi.org/10.17721/2520-2626/2019.24.7

***Аляксандр Агееў***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
прафесар кафедры археалогіі
і спецыяльных гістарычных дысцыплін,
УО "МДУ імя А. А. Куляшова" г. Магілёў, Беларусь

ORCID: 0000-0001-6926-8783
Email: aheyeu@tut.by

## *ВЫТОКІ ВЫТВОРЧЫХ КАНФЛІКТАЎ НА ПРАМЫСЛОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ ПАСЛЯСТАЛІНСКАГА ЧАСУ І СПОСАБЫ ІХ УРЭГУЛЯВАННЯ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ БССР)*

***Анотація***. *У статті розглядаються суперечності та виробничі конфлікти на промислових підприємствах БРСР, у т.ч. страйки, що мали місце у другій половині 1950–1960-х років. Основними причинами конфліктних ситуацій були факти корупції, зниження заробітної плати, зміни форм праці та порушення її умов, неефективна система керування підприємствами. Показано чимало фактів зловживання керівниками промислових підприємств своїм службовим становищем при розподілі премій, матеріальної допомоги, санаторних путівок, квартир тощо. Хоча ці питання й знаходилися у сфері контролю парткомів та профкомів, але ефективність їхньої роботи була низькою. Бюрократична система керівництва і господарювання показала свою неспроможність домогтися здійснення на практиці обіцяних норм соціальної справедливості. Робітники в умовах ослаблення репресивного законодавства усе частіше наважувалися на різні форм протесту і навіть на ескалацію конфліктів. Аналіз архівних матеріалів дозволив виявити 62 факти відмови від праці на промислових підприємствах БРСР лише упродовж 1956–1965 років. Боротьба робітників за свої права, у тому числі страйки робітників, не являли безпосередньої загрози існуванню політичному режиму, але стали одним із факторів, що підвищили увагу партійних і господарчих органів управління до ситуації у промисловості. Було здійснено адміністративні та організаційні спроби наведення порядку у преміюванні керівників, інженерно-технічних робітників і службовців. Партійні і господарські органи управління прагнули уникнути публічності розгляду конфліктних ситуацій. В умовах панування командно-адміністративної системи органи управління не були готові до партнерських стосунків із працівниками. Конфлікти у соціалістичному суспільстві вони сприймали як випадковість та використовували в конфліктних ситуаціях тактику організованого психологічного тиску, вимагали від робітників односторонніх поступок. По суті, така тактика була самообманом і у стратегічному плані не призводила до вирішення конфліктів.*

***Ключові слова***: *промисловість, виробничі конфлікти, страйки, корупція, Бєларусь, БССР, Витебськ, Мінськ, Могильов, Гомель.*

***Aliaksandr Aheyeu***
Ph.D. in History, Professor,
Department of archeology and supplement historical disciplines,
A.A. Kuliashov State University, Mogilev, Belarus

## *ORIGINS OF CONFLICTS AT WORK ON INDUSTRIAL ENTERPRISES AT THE POST-STALIN TIME AND WAYS OF THEIR RESOLUTIONS (ON THE MATERIALS OF THE BELORUSSIAN SOVET SOCIAL REPUBLIC)*

***Abstract.*** *The article discusses contradictions and conflicts at work on the industrial enterprises of the BSSR, including strikes, in the second half of the 1950s and in 1960s. The main reasons for the conflict were the facts of corruption, lower salaries, changes in working conditions, and the inefficient enterprise and management system. There were a lot of facts of abuse by the authorities of their service ranks by distribution of bonuses, financial aids, passports to sanatoria, apartments and so on. Although these questions were under control of party's and trade union's committees, the effectiveness of their work was low. The bureaucratic system of supervision and management has shown its inconsistency of practical implementation of promised social justice standards. In the face of weakening repressive legislation workers increasingly decided for various forms of protest and even for escalation of conflicts. An analysis of archival materials revealed 62 facts of refusal to work at industrial enterprises of the BSSR only during the period from 1956 till 1965. Struggle of workers for their rights including strikes of workers created no danger for the political regime, but became a factor which increased the attentiveness of party's and economic authorities to the situation in industry. Administrative and organizational attempts to stop the rot in giving bonuses to the heads, engineers, technical personal as*

well as office workers were done. Party's and economic governing bodies tried to avoid publicity in considering of conflict situations. Under the dominance of the command and administrative system, the management bodies were not ready for partnership relations with employees. They perceived conflicts in a socialist society as an accidents and used tactics of organizational and psychological pressure in conflict situations and demanded unilateral concessions from workers. In essence, this tactic was self-deception and, in a strategic plan, did not lead to conflicts' resolutions.

***Keywords:*** *industry, conflicts at work, strikes, corruption, Belarus, BSSR, Vitebsk, Minsk, Mogilev, Gomel.*

Гістарычныя перадумовы многіх сучасных канфліктаў у постсавецкіх краінах сваімі каранямі сыходзяць у часы існавання СССР. У савецкай гістарыяграфіі сацыяльных канфліктаў на прамысловых прадпрыемствах Савецкага Саюза нібыта не было да і быць не магло ў сілу агульнанароднага характару ўласнасці на сродкі вытворчасці. Парадаксальна, але ў сваю чаргу такія ўяўленні супярэчылі самім асновам марксісцка-ленінскай тэорыі, якая не толькі абапіралася на гегелеўскую тэорыю антаганістычных і неантаганістычных супярэчнасцяў, дыялектычны закон адзінства і барацьбы супрацьлегласцяў, але менавіта пастаянную барацьбу супрацьлегласцяў лічыла рухавіком развіцця і прагрэсу. Марксізм прапанаваў вельмі дэталёвую канцэпцыю сацыяльных канфліктаў, якія ўласцівы ўсім узроўням сацыяльнага жыцця, а прычынай якіх называў прыватную ўласнасць. Тым не менш, працуючы ў адносінах да капіталістычных краін пастулат у марксісцкай літаратуры казуістычна абвяргаўся пры разглядзе сацыялістычнай гаспадарцы, дзе рабочыя і кіраўнікі павінны былі ўяўляць адзіную палітычную і вытворчую сілу, якая мела агульную мэту – пабудову камунізму. Нядзіўна, што канфлікты на вытворчасці ў сталінскі час як у палітыцы, так і ў навуцы, і ў мастацтве зводзіліся да супраціўлення былых пануючых класаў, ворагаў народа, а ў пасляcталінскі перыяд – да індывідуальнай барацьбы кансерватараў і наватараў.

Пры тым, што агульная канфліктaлогія ў свеце паступова развівалася, назваць у беларускай гістарыяграфіі гістарычныя працы, у якіх бы аналізаваліся вытворчыя канфлікты на прамысловых прадпрыемствах, крайне праблематычна да перыяду "перабудовы". Нашы даследаванні на матэрыялах БССР паказалі наяўнасць шматлікіх вытворчых канфліктаў на беларускіх прамысловых прадпрыемствах, нават забастовачнага руху ў пасляcталінскі час. Так, на тэрыторыі БССР намі выяўлена толькі ў 1956-1965 гг. больш за 60 прыкладаў адмовы рабочых ад працы на прамысловых, транспартных прадпрыемствах і будоўлях, які трапляюць пад вызначэнне "забастоўка" [1]. Як сведчаць дакументы, партыйныя і гаспадарчыя органы кіравання спрабавалі рэагаваць на "пагаршэнне дысцыпліны" на прадпрыемствах і ўстановах, на ўсё больш частыя факты карумпаванасці кіраўніцтва прадпрыемстваў, прымалі пастановы і рашэнні, якія павінны былі перадухіляць канфлікты на вытворчасці, вельмі рэдка дазвалялі канфліктным сітуацыям выйсці з-пад кантролю. Першасная спроба аналізу канфліктаў і спосабаў іх урэгулявання на прамысловых прадпрыемствах была тэзісная прадпрынята намі летась [3].

Разгляд прамысловых канфліктаў савецкага часу нам уяўляецца карысным не толькі з пункту гледжання гістарыяграфічнага інтарэсу, але і з пазіцый вырашэння сённяшніх канфліктаў на вытворчасці, бо гістарычныя перадумовы, іх, так бы мовіць, карані сыходзяць у савецкія часы. Вытворчыя канфлікты на прадпрыемствах БССР, як нам уяўляецца, цікавыя не толькі беларускім даследчыкам, бо сітуацыя ў прамысловасці іншых рэспублік СССР вызначалася агульнымі грамадска-палітычнымі і сацыяльна эканамічнымі фактарамі. У той жа час менавіта на тэрыторыі Украіны і Беларусі ў сілу гістарычнай, рэгіянальнай, ментальнай і этнічнай блізкасці многія сацыяльна-эканамічныя працэсы і канфлікты найбольш падобныя. Напрыклад, нягледзячы на наяўнасць адрозніваннях у галіновай структуры прамысловасці дзвюх краін, найбольш істотную ў Данецкім рэгіёне, назіралася найбольшая ў параўнанні з іншымі рэспублікамі СССР падабенства іншых рэгіёнаў УССР са структурай прамысловасці БССР, былі дастаткова падобнымі істотныя характарыстыкі кадравага патэнцыялу, тэмпаў і характару ўрбанізацыі, дэмаграфічная сітуацыя і г.д. Нават у параўнанні з рэспублікамі Прыбалтыкі, а тым больш з каўказскімі ці сярэднеазіяцкімі рэспублікамі, сітуацыя менавіта на тэрыторыі Беларусі і Ўкраіны падаецца найбольш блізкай і параўнальнай.

**Мэта** артыкула – выявіць на матэрыялах БССР вытокі вытворчых канфліктаў на прамысловых прадпрыемствах пасляcталінскага часу і спосабы іх урэгулявання.

**Выклад асноўнага матэрыялу.** У выніку хуткай індустрыялізацыі ў 1950-70 гг. БССР пераўтварылася ў індустрыяльна-аграрную рэспубліку, кіраванне якой ажыццяўлялася цэнтралізавана ў межах камандна-адміністрацыйнай сістэмы. Шпаркі рост гарадоў і гарадскога насельніцтва, прамысловасці рэспублікі выклікаў пэўны дысбаланс у грамадстве ў самых розных сферах. Нягледзячы на велізарныя ў колькасным вымярэнні паказчыкі росту прамысловасць БССР назапашвала праблемы, якія сярод іншага выяўляліся ў вытворчых канфліктах. Дзеля разумення іх прыроды трэба памятаць, што ва ўмовах панавання планавай цэнтралізаванай камандна-адміністрацыйнай сістэмы кіравання эканомікай развіццё прамысловасці вызначалася дырэктывамі партыйных і савецкіх органаў, а не аб'ектыўнымі патрабаваннямі эканомікі і спажывецкага рынку. Таксама важна ўсведамляць, што агульны кантроль за развіццём прамысловасці

здзяйсняўся ў савецкія часы партыйнымі органамі. Партыйныя арганізацыі адсочвалі таксама сацыяльную і палітычную сітуацыю на месцах. На прамысловых прадпрыемствах склаўся так званы “трохкутнік”: адміністрацыя, партыйная і прафсаюзная арганізацыі, якія ў рэальнасці ўвасаблялі дырэктар, парторг і прафорг. Яны вырашалі галоўныя пытанні і фармальна неслі салідарную адказнасць за поспехі і няўдачы ў кіраванні прадпрыемствамі, але менавіта адміністрацыя на прадпрыемствах найчасцей адчувала сябе гаспадаром суб’екта гаспадарання.

Пад канфліктамі традыцыйна разумеюць супрацьстаянне, сутыкненне, супрацьборства інтарэсаў, поглядаў, пазіцый, па меншай меры двух бакоў. Вывучэнне гістарычных крыніц паказвае, што на прамысловых прадпрыемствах БССР абмежаванасць рэсурсаў, якія падлягалі размеркаванню, найчасцей выклікала падобнае супрацьстаянне і нават супрацьборства. Канфлікты выяўляліся пры змене сістэм аплаты працы, падзеле прэмій, матэрыяльнай дапамогі, санаторных пуцёвак, кватэр. Паступовае памяншэнне страху сталінскіх рэпрэсій прывяла да павелічэння фактаў злоўжывання кіраўніцтва прадпрыемстваў сваім службовым становішчам. Ва ўмовах слабога грамадскага кантролю праблема набыла агульнарэспубліканскі характар.

Праведзеныя ў канцы дзесяцігоддзя праверкі паказалі, што на заводах і фабрыках у другой палове 1950 гг. укаранілася практыка непрапарцыянальнага выдаткоўвання сродкаў прадугледжаных на прэміраванне і аказанне матэрыяльнай дапамогі работнікам. Нягледзячы на тое, што ў сярэдзіне 1950 гг. былі зацверджаны новыя палажэнні аб прэміраванні, аб размеркаванні жылля, а фонд дырэктара з 1955 г. стаў фондам прадпрыемства, звычка адзінаасобна рашаць гэтыя пытанні яшчэ доўгія гады вызначала стыль паводзін многіх кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў. Пры размеркаванні прэмій і дапамогі адсутнічала галоснасць. Правы рабочых і “нізавых” служачых у той ці іншай ступені ўшчамляліся. У той жа час кіраўніцтва прадпрыемстваў мела незаслужаныя з пункту гледжання савецкай маралі прывілеі. Так, толькі за першае паўгоддзе 1958 г. дырэктар Мінскага трактарнага завода атрымаў 46 706 руб., галоўны бухгалтар – 25 446 руб., дырэктар Мінскага аўтамабільнага завода – 40 351 руб., галоўны бухгалтар – 20 239 руб. Для параўнання дастаткова ўказаць, што прэстыжны легкавы аўтамабіль “Волга” у тыя гады каштаваў 40 000 руб. [2, с. 55].

ЦК КПБ і Савет Міністраў БССР у жніўні 1959 г. вымушаны быў прыняць спецыяльную пастанову “Аб мерапрыемствах па рашучаму навядзенню парадку ў прэміраванні кіраўнікоў, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых, якія заняты ў народнай гаспадарцы БССР”. Кампанія па яе рэалізацыі прывяла да зніжэння фактаў найбольш відавочных парушэнняў палажэння аб прэміраванні, але савецкая сацыяльная справядлівасць парушалася і ў наступныя дзесяцігоддзі [10].

Аналагічная сістэма склалася і з размеркаваннем кватэр, якія на прадпрыемствах часцяком размяркоўваліся за “закрытымі дзвярамі” без удзелу завадскіх камітэтаў. Перш наперш парушаліся правы рабочых, у тыя ж часы інжынерна-тэхнічныя работнікі прадпрыемстваў знаходзіліся ў прывіліяваным становішчы. Так, у 1965 г. рабочыя г. Бабруйска атрымалі 50% выдзеленага жылля, хаця іх доля ў колькасці насельніцтва горада складала 65% [2].

Хаця выдаткоўванне сродкаў прадугледжаных па каштарысу на прэміраванне і аказанне матэрыяльнай дапамогі работнікам, размеркаванне санаторных пуцёвак і кватэр знаходзіліся ў сферы кантролю парткамаў і прафкамаў, але фактычна эфектыўнасць такога кантролю была нізкай.

Паказальным можна лічыць пасяджэнне Бюро Віцебскага абкама КПБ 25 снежня 1961 г., на якім разглядалася пытанне “Аб няправільных паводзінах кіруючых работнікаў завода радыёдэталяў”. Члены Бюро канстатавалі, што на заводзе маюцца парушэнні працоўнага заканадаўства, пераносы выходных дзён, “празмернае захапленне” звышурочнымі працамі; што дырэктар завода “акружыў сябе падхалімамі, адарваўся ад калектыву, дапускае ў адносінах да падначаленых грубасць, бюракратызм, паводзіць сябе фанабэрыста, ігнаруе меркаванні спецыялістаў, абражае і глушыць іх ініцыятыву”. Было прызнана, што дырэктар незаконна набыў тэлевізар, будаўнічыя матэрыялы, бясплатна карыстаўся маёмасцю завадскіх грамадскіх арганізацый. Усё гэта, на думку членаў бюро абкама КПБ, стала магчымым ва ўмовах адсутнасці партыйнага кантролю і беспрынцыповасці з боку партбюро, сакратар якога, як і іншыя кіраўнікі завода, таксама “набыў тэлевізар незаконным шляхам”. Члены бюро пастанавілі зняць з пасады дырэктара завода. Віцебскаму гаркаму партыі даручылі прыцягнуць да адказнасці іншых кіраўнікоў прадпрыемства. Паказальна, што падставай для праверкі завода сталі заяўленні рабочых адрас ЦК і абкама партыі, а не кантроль партыйнай ці прафсаюзнай арганізацыі прадпрыемства [6, арк. 118-119]. Такіх прыкладаў дастаткова, каб сцвярджаць, што не толькі абмежаванасць рэсурсаў спрыяла нараджэнню канфліктаў на вытворчасці, але і структура кіравання і кантролю.

Адным з важным фактараў, які меў істотнае значэнне для павышэння ўвагі партыйных і гаспадарчых органаў кіравання да грамадска-палітычнай сітуацыі, размеркавання сродкаў, сістэмы нарміравання і аплаты працы, кадравай палітыцы на прадпрыемствах ў канцы 1950-1960 гг. стала барацьба работнікаў за свае правы. Партыя ў другой палове 1950 гг. стварыла ўмовы для дэмакратызацыі па савецку, і адразу павялічылася колькасць скаргаў, выступленняў, хваляванняў і нават забастовак на прадпрыемствах. Пасля адмены сталінскага

заканадаўства, якое фактычна замацоўвала работнікаў за сваімі заводамі і фабрыкамі, пачынаецца рост рухомасці кадраў, што нярэдка з'яўлялася адной з формаў пасіўнага пратэсту рабочых і служачых.

Пасля прыпынення эпохі масавых рэпрэсій работнікі прамысловасці ўсё часцей сталі рашацца на актыўныя формы пратэсту ў працэсе адстойвання сваіх правоў, на эскалацыю канфліктных сітуацый. Прычым ёсць усе падставы меркаваць, што ў сапраўднасці колькасць выпадкаў канфліктаў, якія даходзілі да адмовы ад працы рабочых была значна вышэйшай, чым выяўленая намі лічба 62 за 1957-1965 гг., бо прыпыненне працы падрывала аўтарытэт кіруючых кадраў прамысловасці, партыйных органаў, і пры магчымасці факты стачак на прадпрыемствах усяляк прыхоўваліся, а пры немагчымасці іх утойвання прымяншаліся іх памеры.

Першыя выяўленыя намі на тэрыторыі БССР забастоўкі адбыліся ў 1957 г. Па выяўленых намі матэрыялах у 1957-1965 гг. большая палова стачак здарылася ў буйнейшым прамысловым цэнтры БССР г. Мінску. Забастоўкі, хаця і меншыя па колькасці ўдзельнікаў, адбываліся ў месцах высокай канцэнтрацыі рабочых – буйных прамысловых цэнтрах усходняй Беларусі. Факты адмовы ад працы меліся на заводах Бабруйска, Віцебска, Гомеля, Магілёва. Асобныя забастоўкі адбываліся ў сярэдніх, невялікіх гарадах і мястэчках: у Крычаве, Оршы і г.д. Амаль усе забастоўкі мелі лакальны характар, цягнуліся менш трох сутак [1].

Актыўнасць у барацьбе за свае правы выяўляў рабочы клас г. Віцебска, дзе адбылося 18 % усіх забастовак БССР. Адной з галоўных прычын прыпынення працы былі пытанні нарміравання працы. Так, 10 чэрвеня 1958 г. дырэктар Віцебскага завода радыёдэталяў выдаў загад аб увядзенні новых нормаў з 2 чэрвеня, што абурыла рабочых і выклікала прыпыненне працы 17 чэрвеня. Канфлікт разбіраўся на бюро Віцебскага абкама КПБ 30 чэрвеня. Было канстатавана, што адміністрацыя парушыла дзейнае заканадаўства. Дырэктару была абвешчана строгая вымова з занясеннем ва ўліковую картку, галоўнаму інжынеру – вымова, сакратару партарганізацыі было ўказана на "запушчанасць" партыйна – палітычнай работы. Бюро абавязала не толькі кіраўніцтва прадпрыемства, але і гаркамы, райкамы партыі і камсамолу, абкамы прафсаюзаў, аблпрафсавет, фабрычна-завадскія камітэты прымаць больш актыўны ўдзел у распрацоўцы і здзяйсненні тэхнічных, гаспадарчых і арганізацыйных мерапрыемстваў на прадпрыемствах, усталяваць сістэматычны кантроль за працай па перагляду нормаў выпрацоўкі, не дапушчаць "паспешлівасці і фармалізму" у гэтай справе [7, арк. 27-29].

Звышаператыўнасць у разборы факта адмовы ад працы рабочых выявілі віцебскія камуністы ў 1959 г. У ткацкім цэху Віцебскай шаўкаткацкай фабрыцы 13 і 14 красавіка быў дапушчаны зрыў работы. У гэты жа дзень 14 красавіка пытанне "Аб недахопах пры пераглядзе нормаў выпрацоўкі на шаўкаткацкай фабрыцы" разглядалася на бюро абкама партыі. Было кастатавана, што "падрыхтоўчыя мерапрыемствы па перагляду нормаў выпрацоўкі былі праведзены на нізкім узроўні, без належнага тлумачэння рабочым мэтаў і задач перагляду састарэлых нормаў…", што Віцебскі гаркам і Першамайскі райкам КПБ не прынялі належных мер і не зрабілі адпаведных вывадаў з пастановы Бюро абкама ад 30 чэрвеня 1958 г. у сувязі з парушэннямі працоўнага заканадаўства на заводзе радыёдэталяў [9, арк. 135-137]. Падобныя рэакцыя і рашэнні партыйных органаў былі тыповымі і пры адмовах рабочых ад працы на іншых прамысловых прадпрыемствах БССР.

Пік забастовак прыйшоўся на 1961-1963 гг. Калі ў 1956-1960 гг. намі выяўлена 20 такіх фактаў, то ў 1961-1965 гг. – 42. Асабліва значным быў усплёск стачачнай барацьбы ў 1962-1963 гг. Яе ўзровень у гэтыя гады перавышаў сярэднегадавы за ўвесь перыяд у 2 разы [1]. У гэтай сувязі трагічныя падзеі 1962 г. у Новачаркаску не выглядаюць выпадковымі.

Так, у Магілёве 3 студзеня 1961 г. рабочыя механічных майстэрань і электрамайстэрань серавугляроднай вытворчасці завода № 511 не працавалі да абеду, а 4 студзеня рабочыя рамонтна-механічнага ўчастка № 3 – увесь дзень. Пытанне разглядалася на пасяджэння бюро Магілёўскага ГК КПБ. У верасні 1962 г. бюро Магілёўскага гаркома КПБ разглядала адразу два факты адмовы ад працы магілёўскіх рабочых. У пратаколе ўказана, што падобныя факты адмовы ад працы на іншых прадпрыемствах назіраліся і раней. Нягледзячы на прынятыя меры ў лістападзе 1962 г. падставай для чарговай размовы на бюро стала адмова ад працы на Стушкаткацкай фабрыцы. Усяго на прадпрыемствах Магілёва па нашых падліках рабочыя за 1957-1970 гг. як мінімум 10 разоў адмаўляліся ад працы, рабочыя Бабруйска прыпынялі працу восем разоў, Крычава – тры разы [4].

У Гомельскай вобласці намі зафіксавана ўсяго пяць падобных выступленняў рабочых. Затое ў Гомелі адбылося найбуйнейшае выступленне: 1 ліпеня 1957 г. тры змены не працавалі галоўны канвеер аднаго з буйнейшых прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі – завода "Гомсельмаш" [1].

Прычыны стачак былі самыя разнастайнымі: размеркаванне прэміяльных фондаў, змены нормаў нармавання на прадпрыемствах, цяжкія, у тым ліку санітарна-гігіенічныя, умовы працы і г.д. У пастановах партыйных, дзяржаўных, прафсаюзных і іншых органаў кіравання па выніках разгляду такіх фактаў усяляк падкрэслівалася, што прычына забастовак – канкрэтныя памылкі непасрэдных кіраўнікоў прадпрыемстваў, слабая кадравая і грамадска-палітычная работа, а не сістэмныя і сацыяльна-эканамічныя фактары. Кіраўнікі прадпрыемстваў, дзе адбываліся канфлікты, як

правіла, атрымоўвалі адносна лёгкія пакаранні па партыйнай лініі, іх праца ставілася пад пільны кантроль партыйных органаў на гарадскім і абласным узроўнях.

Рабочы рух БССР у гэты час не выйшаў за межы эканамічных рамак, адкрыта палітычных патрабаванняў на прадпрыемствах Беларусі намі не выяўлена. Аднак, "антысавецкія выказванні" і "факты "паклёпу на нашу савецкую рэчаіснасць" мелі месца ў 1963 г. на Магілёўскіх заводах імя Кірава і імя Куйбышава [1]. Але адзначаныя выключэнні толькі пацвярджаюць агульную тэндэнцыю эканамічнай накіраванасці патрабаванняў рабочых.

Некалькі ўзрасла актыўнасць работнікаў у барацьбе за свае правы і ў дзейнасці прафсаюзных арганізацый, якія былі закліканы дапамагаць партыйным органам і кіраўніцтву прамысловымі прадпрыемствамі кіраваць прадпрыемствамі. Пасля XX з'езда КПСС у канцы 1950 гг. павялічылася колькасць выпадкаў, калі прафсаюзныя камітэты адстойваючы правы членаў прафсаюзаў, уступалі ў канфлікт з адміністрацыямі і нават партыйнымі камітэтамі.

Так, напрыканцы 1956 г. канфлікт паміж дырэкцыяй і партыйнай арганізацыяй з аднаго боку і прафсаюзным камітэтам торфапрадпрыемства "Асінторф" з другога выйшаў на ўзровень Віцебскага абкама КПБ. Абмеркаваўшы матэрыялы праверкі члены бюро абкама партыі прызналі наяўнасць сур'ёзных недахопаў у дзейнасці ўсіх трох структур. У выніку прафсаюзны сходы па цэхах праходзілі без кантролю партарганізацыі, а галасаванне па выбарах членаў тарфянога камітэта праводзілася тройчы. Нягледзячы на факт відавочнага франдзёрства члены абкама партыі ва ўмовах хрушчоўскай "дэмакратызацыі" не рашыліся адмяніць рашэнне нізавога прафсаюзнага органа аб перавыбарах апальнага старшыні прафкама [8].

У Магілёве 25 красавіка 1966 г. частка работнікаў друкарні адмовіліся працаваць у другую змену і пайшлі дадому з-за рамонту будынка і забруджванні яе асобных участкаў. Падтрымаў калег і сышоў з працы і член партбюро і старшыня прафсаюзнага мясцовага камітэта Карасёў. Па Карасёву было рэкамендавана "рашыць пытанне аб яго знаходжанні членам прэзідыўма абкама прафсаюзаў і старшынёй мясцовага камітэта" [5, арк. 107-108].

Падобных выпадкаў сумеснага супрацьстаяння рабочых і камітэта прафсаюзаў – адміністрацыі і партыйнай арганізацыі, правядзенне сапраўдных канкурэнтных выбараў у прафсаюзныя камітэты зафіксавана намі крайне мала.

**Высновы**. Прычынамі канфліктных сітуацый на прамысловых прадпрыемствах БССР у другой палове 1950-1960 гг. былі факты карупцыі, зніжэння зарплаты, парушэнні правіл нармавання і ўмоў працы, неэфектыўная сістэма кіравання прадпрыемствамі. У другой палове 1950-1960 гг. намі ў архівах Беларусі выяўлены шматлікія факты злоўжыванняў кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў сваім службовым становішчам пры размеркаванні прэмій, матэрыяльнай дапамогі, санаторных пуцёвак, кватэр і г.д. Бюракратычная сістэма кіравання і гаспадарання паказала сваю нядзольнасць дабіцца здзяйснення на практыцы абвешчаных нормаў сацыяльнай справядлівасці. Кантроль парткамаў і заўкомаў быў неэфектыўным.

Рабочыя ва ўмовах паслаблення рэпрэсіўнага заканадаўства ўсё часцей рашаліся на розныя формы пратэсту і эскалацыі канфліктаў. Барацьба работнікаў за свае правы, у тым ліку забастоўкі рабочых, не ўяўлялі непасрэднай пагрозы існаваўшаму палітычнаму рэжыму, але сталі адным з непрадбачаных фактараў, які меў істотнае значэнне для павышэння ўвагі партыйных і гаспадарчых органаў кіравання да сітуацыі ў прамысловасці. Былі прадпрыняты адміністратыўныя і арганізацыйныя меры па навядзенню парадку ў прэміраванні кіраўнікоў, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых.

Ва ўмовах панавання камандна-адміністрацыйнай сістэмы органы кіравання не былі гатовыя да партнёрскіх адносінах з работнікамі. Партыйныя і гаспадарчыя органы кіравання імкнуліся не рабіць канфлікты публічнымі. Канфлікты ў сацыялістычным грамадстве яны ўспрымалі як выпадковасць і выкарыстоўвалі ў канфліктных сітуацыях тактыку арганізацыйнага і псіхалагічнага ціску, патрабавалі ад работнікаў аднабаковых саступак. Па сутнасці такая тактыка з'яўлялася самападманам і ў стратэгічным плане не вяла да вырашэння канфліктаў.

1. Агеев А.Г. Бастовали ли рабочие до перестройки? *Человек и экономика*. 1991.№ 5. С. 25-27.

2. Агееў А.Р. Антыкарупцыйныя аспекты кадравай палітыкі ў прамысловасці БССР ў 1956-1970 гг. *Кадравая і антыкарупцыйная палітыка як фактары развіцця грамадзянскай супольнасці: зборнік навуковых прац Міжнар. навук.-практ. канф. Магілёў, 24-25 мая 2018 года* / уклад І. А. Пушкін; Ю.М. Бубнаў; рэдкал.: Ю. М. Бубнаў, (адк. рэд.) і інш. Магілёў: МДУХ, 2018. С. 54-59.

3. Агееў А.Р. Вытворчыя канфлікты на прамысловых прадпрыемствах БССР у 1956-1970 гг. Спосабы іх урэгулявання і ўплыў на кадравую палітыку. *Итоги научных исследований учёных МГУ имени А. А. Кулешова 2017 г.: материалы научно-исследовательской конференции, 25 января – 8 февраля 2018 г.* / под ред. Е. К. Сычовой. Могилёв: МГУ имени А. А. Кулешова, 2018. С. 4-6.

4. Агееў А.Р. Паслясталінскія забастоўкі савецкіх рабочых у Магілеве і кадравая палітыка КПБ. *Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац удзельнікаў X Міжнар. навук. канф., 25-26 мая 2017 г., г. Магілёў* / уклад. А. М. Бацюкоў, І. А. Пушкін. Магілёў: МДУХ, 2017. С. 173-174.

5. Пастанова бюро Ленінскагаі райкама КПБ г. Магілёва ад 29. 04. 1966 г. "Аб самавольным сыходзе з працы групы рабочых друкарні імя

Свярдлова". *Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў* Магілёв*скай вобласці (ДАГАМаг). Фонд 6009*. Воп. 4. Спр. 24. Арк. 107-108.

6. Пратакол №8 пасяджэння Бюро Віцебскага абкама КПБ ад 25 снежня 1961 г. "Аб няправільных паводзінах кіруючых работнікаў завода радыёдэталяў". *Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВіц)*. Фонд 1-п. Воп. 5. Спр. 402. Арк. 118-119.

7. Пратакол №9 пасяджэння Бюро Віцебскага абкама КПБ ад 30 чэрвеня 1958 г. Пытанне "Аб парушэнні працоўнага заканадаўства пры пераглядзе нормаў выпрацоўкі на заводзе радыёдэталей". *ДАВіц*. Фонд 1-п. Воп. 4. Спр. 637. Арк. 27-29.

8. Пратакол №29 пасяджэння Бюро Віцебскага абкама КПБ ад 26 снежня 1956 г. пытанне "Аб сур'ёзных недахопах у рабоце дырэкцыі, партыйнага бюро і прафсаюзнага камітэта торфапрадпрыемства "Асінторф". *ДАВіц*. Фонд 1-п. Воп. 4. Спр. 600. Арк. 137-141.

9. Пратакол №32 пасяджэння Бюро Віцебскага абкама КПБ ад 14 красавіка 1959 г. Пытанне "Аб недахопах пры пераглядзе нормаў выпрацоўкі на шаўкаткацкай фабрыцы". *ДАВіц*. Фонд 1-п. Воп. 5. Спр. 24. Арк. 135-137.

10. Пушкін І.А. Злоўжыванні ўладаю і пралікі ў кадравай палітыцы БССР у 1970–1980-я гг. (на прыкладзе Гомельскай, Віцебскай і Магілёўскай абласцей). *Кадравая і антыкарупцыйная палітыка як фактары развіцця грамадзянскай супольнасці: зборнік навуковых прац Міжнар. навук.-практ. канф., Магілёў, 24-25 мая 2018 года* / уклад І. А. Пушкін; Ю.М. Бубнаў; рэдкал.: Ю. М. Бубнаў, (адк. рэд.) і інш. Магілёў: МДУХ, 2018. С. 32-42.

**References**

1. Aheev A.H. (1991). *Bastovali li rabochije do perestrojki?* [If the workers went on strike for Perestroika?]. Chelovek I ekonomika. № 5. 25-27. (In Russian).

2. Aheev A.R. (2018). Antykoruptsijnyja aspekty kadravaj palityky u pramyslovastsi BSSR u 1956-1970 [Anti-corruption aspects of personal policy in industru of the BSSR in 1956-1970]. *Kadravaia i antykaruptsiinaia palityka jak faktary razvitiia gramadzianskai suspolnastsi: zbornik navykovykh prats Mizhnar. navuk.-prakt. kanf. Mahileu, 24-25 maia 2018 goda* [Personal and anti-corruption policy as a factor of development of civil society: collective work of the participants of international of scientific-and-practical conference. Mogilev 2018, May 24-25]. / I. A. Pushkin; Yu.M. Bubnau (eds.). Mogilev: MDUKh. 2018. 54-59. (in Belorussian).

3. Aheev A.R. (2018). *Vytvorchyia kanflikty na pramyslovykh pradpryjemstvakh BSSR u 1956-1970. Sposaby ikh urehuliavannia i uplyvu na kadrovuju palityku* [Contlicts at work on industrial enterprises of BSSR. Ways of their resolutions and influence on personal's policy]. Itogi nauchnykh issledovanij uchenykh MGU imeni A.A. Kuleshova 2017: materialy nauchno-issledovatelskoi konferentsii 25 Janv. – 8 Fevr. 2018 [Results of scientific work of the researchers of A.A. Kuleshov Mogilev state Univ.: matherials of scientific conference, 2018, Jan. 25 – Febr. 8] / E. K. Sychova (ed.). Mohilev: A.A. kulushov MGU. S. 4-6. (In Beloussian).

4. Aheev A.R. (2017). *Pasliastalinskija zabastouki savetskikh rabochikh v Magileve i kadravaja palityka KPB* [Strikes of the Soviet workers in Mogilev in after-Stalin time and personal policy of the Communist Party of Belarus]. *Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац удзельнікаў X Міжнар. навук. канф., 25-26 мая 2017 г., г. Магілёў* [History of Mogilev: Past and Present: collective work of the participants of 10th International scientific conference in Mogilev, 2017, May 25-26] / A. M. Batiukov, I. A. Puskin (eds.). Mogilev: MDUKh. 173-174. (in Belorussian).

5. *Postanova buro Leningradskaga raikama KPB Mahiliova ad 29.04.1966 "Ab samavolnym sykhodze z pratsy grupy rabochikh drukarini imia Sviardlova"* [Resolution of the Administration of Leningrad's District committee of the Communist Party of Mogilev from 29.04.1966 "About the self-willed escape from the work by the group of workers from the Sviardlov printing house"]. *State archive of Public organization of the Mogilev Region (SAPOMog).* Fund 6009. Invent. 4. Act. 24. S. 107-108. (in Belorussian).

6. *Pratakol No. 8 pasiadzhennia Buro Vitsebskaga abkama KPB ad 25 sniezhnia 1961 "Ab nepravilnykh pavodzinakh kirujutshikh rabotnikau zavoda radiiodetalei"* [Protocol No. 8 of the session of administration of the Vitebsk Regional committee of Belarusian communist party from December 25th 1961 "About the wrong behavior of the authorities of the Radio-details' plant"]. *State archive of Vitebsk Region (SAVR)*. Fund 1-p. Invent. 5. Act. 402. S. 118–119. (in Belorussian).

7. *Pratakol No. 9 pasiadzhennia Buro Vitsebskaga abkama KPB ad 30 chervenia 1958. Pytannia "Ab parushenni pracouvnaga zakonadaustva pry peregliadze normav vypratsovki na zavode radiiodetalei"* [Protocol No. 8 of the session of administration of the Vitebsk Regional committee of Belarusian communist party from June 30th 1958. Question "About breaking of Law by the revision of production's norms on the Radio-details' plant"]. *SAVR.* Fund 1-p. Invent. 4. Act. 637. S. 27-29. (in Belorussian).

8. *Pratakol No. 29 pasiadzhennia Buro Vitsebskaga abkama KPB ad* 26 sniezhnia 1956. Pytannie dyrektsyi, partijnaga biuro i prafsaiuznaga kamiteta torfapradpry "Ab surioznykh nedakhopakh u rabotse torfapradpryjemstva "Asintorf" [Protocol No. 29 of the session of administration of the Vitebsk Regional committee of Belarusian communist party from Dec. 26 1956. Question of management, party's office and trade union's committee "About serious problems in the work of the peat-plant *Asintorf*"]. *SAVR.* Fund 1-p. Invent. 4. Act. 600. S. 137-141. (in Belorussian).

9. *Pratakol No. 32 pasiadzhennia Buro Vitsebskaga abkama KPB ad* 14 krasavika 1959. Pytannie "Ab nedakhopakh pry peregliadze normau vypratsouki na shauratskau fabritsi" [Protocol No. 32 of

the session of administration of the Vitebsk Regional committee of Belarusian communist party from April 14th 1959. Question "About the shortcomings by the revision of the production's norms on the silk-waving plant"]. *SAVR.* Fund 1-p. Invent. 5. Act. 24. S. 135-137. (in Belorussian).

10. Pushkin I.A. (2018). *Zlouzhvanni uladaiu i praliki u kadravai palitytsy BSSR u 1970–1980 (na prykladze Gomelskai, Vitsebskai i Magileuskai ablastsei)* [Abuse of power and errors in personals' policy in BSSR in 1970–1980 (on the examples of Gomel, Vitebsk and Mogilev Regions)]. *Kadravaia i antykaruptsiinaia palityka jak faktary razvitiia gramadzianskai suspolnastsi: zbornik navykovykh prats Mizhnar. navuk.-prakt. kanf. Mahileu,* 24-25 maia 2018 goda [Personal and anti-corruption policy as a factor of development of civil society: collective work of the participants of international of scientific-and-practical conference. Mogilev 2018, May 24-25]. / I. A. Pushkin; Yu.M. Bubnau (eds.). Mahileu: MDUKh. 2-42. (in Belorussian).

**УДК 930.2(092)(477.5)"1816/1834"**

***Богдан Вуйко***
аспірант кафедри історії та культури України,
ДВНЗ Переяслав-Хмельницький державний педагогічний
університет імені Григорія Сковороди

ORCID: 0000-0002-9296-6042
Email: mega-bogdan59@ukr.net

# *ПОДОЛАННЯ НОВІТНЬОЮ УКРАЇНСЬКОЮ ІСТОРІОГРАФІЄЮ УПЕРЕДЖЕНОСТІ РАДЯНСЬКИХ ДОСЛІДНИКІВ ЩОДО ВИСВІТЛЕННЯ ПОСТАТІ М. Г. РЄПНІНА*

***Анотація.*** *У статті простежено подолання новітньою українською історіографією упередженості радянських дослідників щодо висвітлення постаті М. Г. Рєпніна. Встановлено, що з ідеологічних міркувань радянські дослідники мало писали про представників правлячої еліти імперської доби. Генерал-губернаторська форма правління висвітлювалася лише як реакційна, груба сила самодержавства та кріпосної системи у регіонах. У такому ж контексті розглядалася й посада військових губернаторів. До уваги не бралися індивідуальні риси військових управителів, не досліджувалися матеріали, які розкривали їхній світогляд, громадсько-політичні переконання. Їхнє бачення перспектив розвитку ввіреного краю розглядалися виключно з упереджених класових позицій. Доведено, що позитивним моментом новітньої української історіографії стало те, що при залученні нової джерельної інформації вона спростувала радянський підхід у ставленні до генерал-губернаторів як до царських сатрапів, які намагалися лише зберегти самодержавство у віддалених регіонах Російської імперії. Звернення до головних постатей генерал-губернаторів, їхніх індивідуальних рис, дало змогу сучасним дослідникам перервати традицію радянської історіографії у цьому питанні. Генерал-губернаторська форма правління і самі урядовці розглядаються вже як посередники у налагодженні конструктивних відносин між центром та регіонами. Так, основна діяльність генерал-губернаторів, у тому числі і М. Г. Рєпніна, переконані дослідники, була спрямована на користь регіонів. Важливим досягненням новітньої української історіографії стало і те, що вийшли праці, спеціально присвячені постаті генерал-губернатора Малоросії М. Г. Рєпніна. Сучасні дослідники переконані, що М. Г. Рєпнін був видатною особистістю не лише для свого часу, але й значною мірою випереджав його. Його світогляд і реальні справи не вписувалися в загальноприйняті на той час імперські канони, а намагання європеїзувати ввірений йому регіон, став тим фактором, який зрештою призвів до його відставки та звинувачення у прагненні до автономізму.*

***Ключові слова:*** *М. Г. Рєпнін, генерал-губернатор, Лівобережна Україна, радянська історіографія, новітня українська історіографія.*

***Bohdan Vuyko***
Postgraduate student, Department of History and Culture of Ukraine,
Pereiaslav-Khmelnytskyi Hryhoriy Skovoroda State Pedagogical University

# *OVERCOMING BY UKRAINIAN HISTORIOGRAPHY PREDICTIONS OF SOVIET RESEARCHES IN THE COVERAGE OF M. REPNIN'S FIGURE*

***Abstract.*** *The article traces the overcoming of the modern Ukrainian historiography of the bias of the Soviet researchers on the coverage of the figure of M.G. Repnin. It is established that, for ideological reasons, Soviet scholars wrote little about representatives of the ruling elite of the imperial era. The governor-general form of government was only highlighted as a reactionary, brute force of autocracy and serfdom in the regions. The position of military governors was considered in the same context. The individual traits of the military governors were not taken into account, materials that revealed their worldview, socio-political beliefs*